наук, доцент (учреждение образования «Могилёвский государственный университет имени А. А. Кулешова», Могилёв, Республика Беларусь); **Манкевич Ж. Б.,** кандидат психологических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Олифирович Н. И.,** кандидат психологических наук, доцент (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Беларусь); **Пергаменщик Л. А.,** доктор психологических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Пинюта И. В.,** кандидат педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Пузыревич Н. Л.,** кандидат психологических наук (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Пучинская Т. М.,** кандидат педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Тарантей В. П.,** доктор педагогических наук, профессор (учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно, Республика Беларусь); **Тарасова Т. Н.,** доктор филологических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Торхова А. В.,** доктор педагогических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Храмцова Ф. И.,** доктор политических наук, профессор, кандидат педагогических наук (филиал федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Российский государственный социальный университет», Минск, Республика Беларусь).

**МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ СЕРИИ**

**Мухтарова Ш. М.,** доктор педагогических наук (Карагандинский государственный университет имени академика Е. А. Букетова, Караганда, Республика Казахстан); **Николаева М. В.,** доктор педагогических наук, доцент, профессор (федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Волгоградский государственный социально-педагогический университет», Волгоград, Российская Федерация); **Селиванов В. В.,** доктор психологических наук, профессор (федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Московский государственный психолого-педагогический университет», Москва, Российская Федерация).

© БарГУ, 2022

Репозиторий БарГУ

“Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Olifirovich N. I.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Pergamenshchik L. A.,** Doctor of Psychology, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Pinyuta I. V.,** Ph. D. in Education, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Puzyrevich N. L.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Puchinskaya T. M.,** Ph. D. in Education, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Tarantey V. P.,** Doctor of Education, Professor (educational institution “Grodno State University named after Y. Kupala”, Grodno, the Republic of Belarus); **Tarasova T. N.,** Doctor of Philology, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Torhova A. V.,** Doctor of Education, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Hramtsova F. I.,** Doctor of Political Sciences, Professor, Ph. D. in Education (educational institution of higher professional education “Russian State Social University”, Minsk, the Republic of Belarus).

**INTERNATIONAL EDITORIAL BOARD OF THE SERIES**

**Muhtarova S. M.,** Doctor of Education (Karaganda State University named after the academician E. A. Buketov, Karaganda, the Republic of Kazakhstan); **Nikolaeva M. V.,** Doctor of Education, Professor (federal budget educational institution of higher professional education “Volgograd State Socio-pedagogical University”, Volgograd, the Russian Federation); **Selivanov V. V.,** Doctor of Psychology, Professor (federal budget educational institution of higher professional education “Moscow State Psycho-pedagogical University”, Moscow, the Russian Federation).

© BarSU, 2022

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ / CONTENTS

### ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ / EDUCATION


**Дегиль Н. И., Старостин С. А.** Модель формирования толерантного отношения студенческой молодежи к беженцам **6** **Dzehil N. I., Starastsin S. A.** Model of formation of tolerant attitude of student youth to refugees

**Кривуть М. Л.** Роль дисциплины «Коммуникативная деятельность педагога инклюзивного образования» в формировании стилей межличностного поведения у студентов **14** **Krivut M. L.** The role of the discipline “Communicative activity of a teacher of inclusive education” in formation of students’ styles of interpersonal behavior

**Романов В. А., Глузман Н. А.** Учебная деятельность студентов в условиях онлайн-обучения в период пандемии COVID-19: стилевые особенности **22** **Romanov V. A., Gluzman N. A.** Learning activity of students in online learning during the COVID-19 pandemic: style features

**Рудая Д. В.** Педагогическая целесообразность внедрения факультативного курса «К олимпийским вершинам» по предмету «Физическая культура и здоровье» в образовательный процесс младших школьников 6—7 лет **29** **Rudaya D. V.** Pedagogical feasibility of introducing the optional course “To the olympic heights” on the subject “Physical training and health” in the educational process of junior schoolchildren aged 6—7

**Унсович А. Н., Яценко Т. Е.** Региональные аспекты непрерывной подготовки педагогических кадров **36** **Unsovich A. N., Yatsenko T. E.** Regional aspects of continuous training of teaching staff


### ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ / PSYCHOLOGY


**Джига Н. Д.** Образ-результат будущего педагога-психолога, являющегося созидателем, в представлениях обучающихся по специальности «Практическая психология» **43** **Juha N. D.** The image-result of a future teacher-psychologist, who is a creator, in the representations of students in the specialty “Practical psychology”

**Иценко А. Г.** Психология религии в религиозно-философском наследии профессора П. Я. Светлова **50** **Itsenko A. G.** Psychology of religion in the religious and philosophical heritage of professor P. Ya. Svetlov

**Клещёва Е. А.** Психологическая диагностика семейной иерархии: авторская проективная методика **57** **Klescheva E. A.** Psychological diagnostics of the family hierarchy: the author’s projective technique

**Комкова Е. И.** Особенности самосознания старших дошкольников с разным уровнем когнитивного развития **62** **Komkova E. I.** Features of self-awareness of older preschoolers with different levels of cognitive development

**Король М. А.** Характеристики толерантности к неопределенности у студентов позднего юношеского возраста из городской и сельской местности **68** **Korol M. A.** Characteristics of tolerance to uncertainty in late youth students from urban and rural areas

**Курило М. В.** Взаимосвязь виртуальной и межличностной виктимности в сети Интернет у учащихся юношеского возраста **74** **Kurilo M. V.** The relationship between virtual and interpersonal victimisation on the Internet in adolescent students


### ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ / PHILOLOGY
#### Литературоведение / Literary studies


**Брусевіч А. А.** Асаблівасці фарміравання матыўна-вобразнага поля паэзіі Вінцэнта Каратынскага **80** **Brusevich A. A.** Features of the formation of a motive-figurative field of Vincent Korotynsky’s poetry

**Садко Л. М.** Полісістэмнасць у літаратурна-крытычных артыкулах і ранняй лірыцы З. Бядулі **86** **Sadko L. M.** Polysystematic approach in literary-critical articles and early lyrics of Z. Byadulya


Репозиторий БарГУ

# *ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ*

## ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

# *PHILOLOGY*

## LITERARY STUDIES

УДК 821.162.1: 821.161.3

**А. А. Брусевіч**
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», вул. Ажэшка, 22, 230023 Гродна, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 581 49 17, brusevich@tut.by

## АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ МАТЫЎНА-ВОБРАЗНАГА ПОЛЯ ПАЭЗІІ ВІНЦЭНТА КАРАТЫНСКАГА

Мэта дадзенага артыкула — на прыкладзе праграмнага верша Вінцэнта Каратынскага "Postrzyïyny" («Пастрыжыны») з дэбютнага зборніка "Czem chata bogata, tem rada" («Чым хата багата, тым рада»), разгледзець некаторыя асаблівасці фарміравання матыўна-вобразнага поля паэзіі згаданага аўтара, у тым ліку генезіс салярнага матыву, які адыгрывае важную ролю ў мастацкай сістэме ўсёй творчасці паэта. Ва ўводзінах звернута ўвага на актуальнасць і навуковую навізну даследавання феномену В. Каратынскага з улікам літаратуразнаўчай інтэрпрэтацыі яго паэтычных твораў. У асноўнай частцы прааналізаваны ідэйна-эстэтычныя асновы мастацкага метаду пісьменніка, паказаны прынцыпы эвалюцыі творчай свядомасці гэтага яркага прадстаўніка беларуска-польскага літаратурнага памежжа. У заключэнні сфармуляваны высновы пра заканамернасць фарміравання матыўна-вобразнага поля паэзіі В. Каратынскага ў сістэме эстэтыкі еўрапейскага рамантызму з арыентацыяй на беларускую фальклорную традыцыю.

**Ключавыя словы:** Вінцэнт Каратынскі; матыўна-вобразнае поле; паэзія; рамантызм; беларуска-польскае літаратурнае памежжа.
Бібліягр.: 13 назваў.

**A. A. Brusevich**
Grodno State University named after Yanka Kupala, 22 Ozheshko Str., 230023 Grodno, the Republic of Belarus, +375 (29) 581 49 17, brusevich@tut.by

## FEATURES OF THE FORMATION OF A MOTIVE-FIGURATIVE FIELD OF VINCENT KOROTYNSKY'S POETRY

The purpose of this article is, using Vincent Korotynsky's poem "Postrzyïyny" from the debut collection "Czem chata bogata, tem rada", to consider some of the features of the formation of the motive-figurative field in the poetry of the author, including the genesis of the solar motive which plays an important role in the artistic system of the poet's work. In the introduction, attention is paid to the relevance and scientific novelty of the study of V. Korotynsky's phenomenon, taking into account the literary interpretation of his poetic works. In the main part, the ideological and aesthetic foundations of the writer's artistic method are analyzed and the principles of the creative consciousness evolution of this outstanding representative of the Belarusian-Polish literary borderland are shown. In the conclusion, the findings are formulated about the formation regularity of the motive-figurative field of V. Korotynsky's poetry in the system of European romanticism aesthetics, with a focus on the Belarusian folk tradition.

**Key words:** Vincent Korotynsky; motive-figurative field; poetry; romanticism; Belarusian-Polish borderland.
Ref.: 13 titles.

© Брусевіч А. А., 2022



Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Постаць Вінцэнта (Вінцэся) Каратынскага і яго спадчына, асабліва паэтычная, выклікаюць цікавасць па некалькіх прычынах: па-першае, беларускамоўныя вершы пісьменніка, хоць іх было не так і шмат, разам з творамі Яна Чачота, Яна Баршчэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Уладзіслава Сыракомлі, Арцёма Вярыгі-Дарэўскага і некаторых іншых аўтараў закладваюць першаасновы новай беларускай нацыянальнай літаратуры; па-другое, польскамоўная творчасць згаданага пісьменніка — не толькі лірыка, але і публіцыстыка, і літаратуразнаўчая, і перакладчыцкая дзейнасць — усё гэта з'яўляецца выдатным адлюстраваннем шматлікіх еўрапейскіх мастацка-эстэтычных і грамадскіх працэсаў, без разумення якіх нельга вытлумачыць сутнасць феномену беларуска-польскага культурнага памежжа, а значыць, і ўсёй айчыннай вербальнай прасторы. Таму і беларускія, і польскія літаратуразнаўцы яшчэ на пачатку ХХ стагоддзя звярнулі ўвагу на В. Каратынскага і адвялі яму пэўнае месца на сваім нацыянальным парнасе. Суседзі нашы, напрыклад, уключылі пісьменніка ў знакаміты двухтомны «Альбом біяграфій заслужаных палякаў і полек XIX стагоддзя» ("Album biograficzne zasiuïonych Polakyw i Polek wieku XIX"), адзначыўшы наступнае: «Калі б болей тэкстаў па сабе пакінуў, гісторыя літаратуры мусіла б залічыць яго з гледзішча на мову і стыль у шэраг найлепшых сучасных творцаў» [1, с. 368]. Для палякаў каштоўнасць В. Каратынскага заключалася (аб гэтым сведчыць той жа «Альбом…») не ў яго арыгінальнай паэтычнай творчасці, а перадусім у працы навуковай, рэдактарскай і выдавецкай. З таго часу (выданне «Альбома…» адбылося ў 1903 годзе) прынятая пазіцыя ніяк не змянілася, чаго не скажаш пра адносіны да паэта з беларускага боку. Тут можна назіраць цэлую эвалюцыю поглядаў адносна месца В. Каратынскага, яго спадчыны ў сістэме нацыянальнай культуры: ад прахалодных, нават скептычных ацэнак першымі даследчыкамі часоў «нашаніўства» і непрымання савецкай крытыкай першай паловы ХХ стагоддзя да поўнага прызнання беларусацэнтрычнай накіраванасці таленту гэтага творцы сучасным літаратуразнаўствам. Напрыклад, калі Максім Гарэцкі сцвярджаў, што «пісанне беларускіх вершаў было быццам нейкім дадаткам да літаратурнай працы пісьменніка ў польскай мове» [2, с. 92], то ўжо Адам Мальдзіс гаворыць пра суадносіны «польскага» і «беларускага» ў творчасці В. Каратынскага зусім у іншым ключы: «Трэба адзначыць, што беларускіх вершаў Каратынскі напісаў значна больш. У 1857 годзе ён хацеў уключыць іх у польскі зборнік "Чым хата багата, тым рада", але паслухаў Сыракомлю і адклаў для сумеснага беларускага зборніка, які, на жаль, ніколі не ўбачыў свету» [3, с. 65]. Сапраўднае ж вяртанне нашага земляка ў шырокі беларускі навуковы і літаратурны кантэкст адбылося дзякуючы старанням Уладзіміра Мархеля, які ўпершыню падрыхтаваў да друку і выдаў у 1981 годзе «Творы» пісьменніка з прадмовай і грунтоўнымі каментарыямі (кніга потым яшчэ некалькі разоў дапаўнялася і перавыдавалася), засведчыўшы, што «такога заглыбленага мастацкага асэнсавання сялянскай нядолі і ўвогуле жыцця чалавека на зямлі ў яго лучнасці з сусветам у беларускай польскамоўнай літаратуры да Каратынскага не было» [4, с. 7]. Сённяшнія даследчыкі (Ірына Бурдзялёва, Ігар Запрудскі, Мікола Хаўстовіч, Алесь Яскевіч і інш.), разглядаючы тыя ці іншыя аспекты творчай спадчыны В. Каратынскага, амаль аднаголасна падкрэсліваюць выключнасць ролі гэтага выдатнага прадстаўніка беларуска-польскага літаратурнага памежжа ў фарміраванні айчыннай вербальнай прасторы, як заўважыла, напрыклад, Жанна Косціна: «Дзякуючы Вінцэсю Каратынскаму, нараджаліся аксіялагічныя арыенціры эстэтычнага ідэалу беларускай літаратуры» [5, с. 161]. Зрэшты, мусім адзначыць, што, нягледзячы на старанні асобных навукоўцаў, многія мастацкія ідэі згаданага аўтара, увасобленыя перш за ўсё ў яго паэтычных тэкстах, да гэтага часу ўяўляюць сапраўдныя лакуны. Такая сітуацыя, вядома, патрабуе неадкладнага вырашэння.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Метадалогія даследавання адпавядае прынцыпам аксіялагічнага і кантэкстнага падыходаў. Дамінантнымі метадамі даследавання выступаюць культурна-гістарычны, біяграфічны, а таксама метад ідэйна-кампазіцыйнага аналізу мастацкага твора.

Репозиторий БарГУ

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Асаблівасці фарміравання матыўна-вобразнага поля паэзіі В. Каратынскага наўпрост звязаныя з часам яго прыходу ў літаратуру: як і шэраг іншых пісьменнікаў, што заявілі пра сябе ў 50-я гады XIX стагоддзя, ён належыць да другога пакалення беларуска-польскіх рамантыкаў. Гэта значыць, у сваёй творчасці, найперш паэтычнай, В. Каратынскі арыентуецца на лепшыя ўзоры прыгожага рамантычнага пісьменства, прычым не толькі на вершы землякоў, але і на заходнееўрапейскіх літаратараў, сярод якіх, напрыклад, П'ер Жан Беранжэ. Зрэшты, ісці праторанай пуцявінай — справа не зусім лёгкая, як можа падацца на першы погляд: такія творцы рызыкуюць апынуцца ў цені сваіх папярэднікаў, а таксама іх могуць абвінаваціць у эпігонстве, што і здарылася з пакаленнем В. Каратынскага: амаль кожнага з той плеяды крытыкі хоць аднойчы, але папракалі ў залежнасці ад А. Міцкевіча, матывуючы свае прэтэнзіі наяўнасцю аналагічных матываў у творчасці. Пры гэтым чамусьці ігнараваўся факт прыналежнасці творцаў да тых самых гістарычных, культурных і грамадска-палітычных рэалій, якія фарміруюць мастацкую свядомасць аўтараў паводле адных і тых жа «лякалаў». Па вялікім жа рахунку падобная «залежнасць» часцей за ўсё з'яўлялася звычайнай данінай павагі першаму рамантыку. Такую даніну яму аддаў і В. Каратынскі. Але не алюзіямі да творчасці вешчуна, ці, скажам, увядзеннем яго постаці ў паэтычныя тэксты, як гэта рабілі Адам Плуг, У. Сыракомля, а напісаннем двух навукова-папулярных нарысаў. У адным з іх знаходзім, дарэчы, тлумачэнне, чаму ў адрозненне ад многіх сваіх сучаснікаў В. Каратынскі ў мастацкіх тэкстах не спяшаўся звяртацца да постаці вялікага навааградчаніна: «Жыццё Адама Міцкевіча нагадвала цудоўную паэму, у параўнанні з якой блякнуць і падаюцца смешнымі легенды <…>, то якую ж можа мець вартасць нязграбная спакуса апаэтызаваць такое жыццё?» [6, с. 13—14]. Праўда, паралелі з міцкевічаўскімі баладамі ды рамансамі ў вершах В. Каратынскага ўсё ж такі можна адшукаць. Але толькі таму, што «з тых самых вясковых крыніц, з любові да народа, прыроды, кнігі, долі і нядолі чэрпаў ён сваё натхненне» [7, с. 1]. Знаўца айчынных і замежных літаратурных тэндэнцый У. Сыракомля ў прадмове да зборніка "Czem chata bogata, tem rada" («Чым хата багата, тым рада») — дэбютнай кнігі малодшага калегі — не толькі тлумачыць патэнцыйнаму чытачу, адкуль бяруцца вытокі самабытнай паэзіі В. Каратынскага, але і звяртае ўвагу на яго абсалютную творчую незалежнасць: «Адораны прыродным талентам, можа ад нас і пераняў любоў да песні, можа пры нас яе і развіваў, аднак рабіў ён гэта цалкам самастойна» [7, с. 1—2]. Пра тое самае гаворыць і сам аўтар у вершы-прэлюдыі "Postrzyïyny" («Пастрыжыны»), запрашаючы братоў па пяры раздзяліць радасць уступлення на пісьменніцкі шлях:

Bóg zesłał was, Bracia, na me postrzyżyny:
Witamy was chlebem i solą!
Ja niemam tu ojca, ni matki jedynej —
Wy za nich obdzielcie mię dolą [8, c. 9].

Радкі, напісаныя рукой рамантыка, нават нягледзячы на ўсю любоў В. Каратынскага да мастацтва «тэндэнцыйнага» (у гэтым паэт пазней прызнаецца ў заўвагах да паэмы "Tomiio" («Таміла»)), нельга ўспрымаць літаральна ці, прынамсі, адназначна. Сіроцтва лірычнага героя ў дадзеным выпадку не толькі сімвалізуе гаротны лёс беларускага народа, ад імя якога, на думку большасці айчынных літаратуразнаўцаў, імкнуўся прамаўляць паэт, але таксама ўвасабляе самастойнасць абранага творчага шляху, адсутнасць намеру азірацца на папярэднікаў. Можна выказаць яшчэ больш смелую гіпотэзу: аўтар дадзенага верша праз матыў просьбы лірычнага героя да «Братоў» замяніць адсутных бацькоў робіць намёк на адыход ад традыцыйнай для беларуска-польскага рамантызму апазіцыі «свой-чужы», дзе «сваё» абавязкова мусіць узвышацца і дамінаваць над «чужым». «Браты», канешне, таксама лічацца сваякамі, аднак В. Каратынскі яўна гаворыць не пра кроўнае, а пра духоўнае сваяцтва, пошукам якога займаліся прыхільнікі літаратурнага касмапалітызму. Разбурэнне згаданай апазіцыі



Репозиторий БарГУ

выяўляецца ў адмове ад звыклай для большасці рамантыкаў ідэалізацыі «свайго», у адчуванні сораму перад сучаснікамі за «нясвежыя песні» айчыннага пісьменства, за адсутнасць у ім яскравай паэзіі:

> Jam Litwin — ach! wstyd mi, o Goście łaskawi!
> Że wziąłem co lepsze z mej kleci,
> A piękne się danie przed Wami nie stawi,
> Gwiaździsta piosenka nie świeci! [8, c. 10].

Вядома, чым хата багата, тым рада (гэтая беларуская прымаўка ў межах уводнага верша «Пастрыжыны» гучыць рэфрэнам ажно пяць разоў), таму пачцівыя госці (чытачы, іншыя літаратары — як свае, так і чужыя) не павінны патрабаваць ад гаспадара (ад усёй існуючай вербальнай традыцыі на беларуска-польскім памежжы) таго, чаго даць пакуль нельга. Але сітуацыя неўзабаве мусіць змяніцца, і тады ўсё будзе зусім інакш: весела і ўрачыста. Застаецца толькі дачакацца, калі «роднае вёсцы заззяюць тры сонцы» [9, c. 16]: “Lecz kiedy mej wiosce trzy sionka zabiyњnie // I dusze wesoioњж ogarnie, <...> O! wtedy Was prosim na inne obrzkdy, // Na biaie koiacze bez pleњni” [8, c. 12]. Найбольш загадкавы і цікавы тут вобраз «трох сонцаў», ад з’яўлення якіх залежыць, ці дачакаюцца шчаслівага лёсу героі верша «Пастрыжыны». Расшыфроўка сімволікі дадзенага вобраза, як, відаць, і задумаў аўтар верша, наблізіць нас да разумення даволі няпростай канцэпцыі ўсяго мастацкага свету В. Каратынскага, а таксама дапаможа «па вартасці ацаніць і сам унікальны тып творчасці паэта, сцверджаны ім на сінтэзе (ці, прынамсі, на сумежжы) розных творчых метадаў» [10, c. 152]. «Трайное» сонца, дарэчы, вельмі рэдка сустракаецца ў мастацкай літаратуры. Магчыма, таму, што і саму з’яву, вядомую пад назвай «паргелій», у прыродзе не часта даводзіцца бачыць. Можна дапусціць, што вобраз быў «падгледжаны» В. Каратынскім у трэцяй частцы драматычнай трылогіі «Генрых VI» Уільяма Шэкспіра, любімага ўсімі рамантыкамі творцы. Адкуль ён узяўся ў свядомасці апошняга — яшчэ большая загадка. Ёсць гіпотэза, быццам «вобраз трох сонцаў навеяны трыма агнямі, якія, казалі відавочцы, свяціліся над статуяй Афіны Палады ў Афінах. Багіня трымала вялізнае бліскучае кап’ё, а сонечнае святло адбівалася ад яго такім чынам, што над багіняй узнікалі тры яркія шары» [11, c. 269]. Цалкам верагодна, што беларускі пісьменнік таксама чуў гісторыю пра грэцкую статую і натхніўся апаведам, тым болей што «Афіну называлі Дзясятай музай, якая валодае якасцямі астатніх дзевяці муз» [11, c. 269]. Гэтая версія добра тлумачыць адну з магчымых ідэй, закладзеных В. Каратынскім у праграмным вершы «Пастрыжыны»: маўляў, прыйдзе час — і беларускае пісьменства (у тэксце яно ўвасабляецца ў вобразе «маёй вёскі») выйдзе на сусветны ўзровень. Сам паэт, як вядома, прыкладаў усе намаганні дзеля набліжэння такой пары, аб чым сведчыць найперш яго беларускамоўная лірыка (адно з трох сонцаў, калі пад сонцам разумець літаратуру з яе трыма родамі — лірыкай, эпасам і драмай).

На незвычайны вобраз звярнуў увагу і А. Мальдзіс, нават адзначыў яго клічнікам: «Каратынскі піша, што ў хаце сваёй паэзіі ён можа пачаставаць чытача толькі хлебам з мякінаю: дзе ж знайсці прысмакі ў час народнага ліхалецця?! Але калі над роднай вёскай “тры сонейкі (!) заззяюць і душу агорне весялосць”, тады паэт запросіць землякоў на іншую бяседу, на іншыя песні» [3, c. 71]. Далей даследчык працягвае разважаць над праблематыкай іншых вершаў, адзначаючы, што і там гаворыцца «аб хуткіх пераменах і ўзыходзе сонца свабоды» [3, c. 71]. Для А. Мальдзіса, засяроджанага на сацыяльна-палітычным кантэксце паэтычнай спадчыны В. Каратынскага, як бачым, і «тры сонейкі», і проста вобраз сонца — усё гэта атаясамліваецца з матывам свабоды. Безумоўна, такі матыў у эстэтыцы еўрапейскага рамантызму адыгрывае выключную ролю, таму ні ў якім разе нельга адмаўляць гіпотэзы А. Мальдзіса. Наадварот, можна развіць яго ідэю і дапусціць, што пад трыма сонцамі паэт меў на ўвазе свабоду, роўнасць і братэрства. Гэтыя словы красаваліся на сцягах Вялікай

Рэпазіторый БарДУ

французскай рэвалюцыі як абяцанне змяніць свет да лепшага (на гэта спадзяецца і лірычны герой верша «Пастрыжыны»).

Не будзем пакідаць без увагі і захапленне В. Каратынскага народнай культурай, што, зрэшты, уласціва эстэтыцы мастацкага кірунку, абранага паэтам. У аўтарскіх каментарыях да паэмы «Таміла» чытаем наступнае: «Песні і казкі народа — гэта вобраз яго сэрца і фантазіі, паданні і прымаўкі — гэта яго гісторыя і філасофія» [9, с. 151]. Вершы, што ўвайшлі ў кнігу, назву якой дала беларуская прымаўка, В. Каратынскі мусіў напоўніць спрадвечнай народнай мудрасцю. З гэтага ракурсу можна разглядаць і вобраз сонца, улічваючы «яго аднесенасць да скрайняга станоўчага полюса аксіялагічнай шкалы» [12, с. 478]: калі сонца ў народнай свядомасці асацыюецца з жыватворнай, невычэрпнай крыніцай дабра, то паэт усё гэта множыць на тры (варта згадаць, што лічба «тры» — гэта і «міфарытуальны сімвал, які фігуруе ў многіх архаічных абрадах» [13, с. 506]), сцвярджаючы такім чынам ідэю недасяжнасці рамантычнага ідэалу.

А яшчэ тры сонцы ў вершы В. Каратынскага могуць сімвалізаваць Святую Тройцу (як і тры хрысціянскія цноты — веру, надзею і любоў), што цалкам укладваецца ў мастацка-эстэтычную сістэму рамантызму, а таксама сведчыць «аб унікальным творчым метадзе паэта, заснаваным на нацыянальна заглыбленым хрысціянскім светаэкзістэнцыяванні» [10, с. 156]. Нездарма ў яго знакамітым «вершы з праграмнай устаноўкай» [10, с. 158], упісаным у «Альбом…» А. Вярыгі-Дарэўскага, пры пералічэнні дамінантных матываў, якія павінны прагучаць у новай беларускай літаратуры, прыярытэт надаецца тым, што маюць сувязь з народным светасузіраннем, заснаваным на хрысціянскіх каштоўнасцях: «Будзе пець мужыком // Аб Язуску святом, // Аб матульцы святой, // Аб зямельцы радной, // Аб сардэчных палях, // Аб мужыцкіх панах, // Аб суддзях, што як змей, // Аб свабодзе людзей, // Аб дабры, што Бог дасць, // Як адрыне напасць!» [9, с. 11]. Калі ўважліва прыгледзецца да гэтай своеасаблівай іерархічнай лесвіцы, то і тут можна вылучыць тры найбольш яркія матывы (сонцы): Бога, радзіму і свабоду. Гісторыя айчыннай і замежнай літаратуры паказвае, што менавіта яны складаюць ідэйна-філасофскую і мастацка-эстэтычную асновы еўрапейскай рамантычнай традыцыі, да якой належаў і В. Каратынскі.

**Заключэнне.** Творчасць В. Каратынскага, аднаго з яскравых прадстаўнікоў беларуска-польскага рамантызму, да гэтага часу застаецца збольшага не даследаванай, асабліва калі гаворка ідзе пра польскамоўную паэтычную спадчыну пісьменніка, якая ў літаратуразнаўстве пакуль што прадстаўлена даволі фрагментарна і не адлюстравана ні ў адной манаграфічнай працы.

У паэзіі В. Каратынскага можна адшукаць пэўныя вобразы і матывы, якія сведчаць пра яго арыентацыю на лепшыя ўзоры тагачаснай рамантычнай літаратуры, але разам з тым назіраецца і жаданне творцы да самастойнай інтэрпрэтацыі тых альбо іншых эстэтычных ідэй рамантызму.

Фарміраванне матыўна-вобразнага поля паэзіі В. Каратынскага адбывалася пад уплывам як літаратурна-кніжнай, так і фальклорнай традыцыі, перадусім беларускай, што ў далейшым абумовіла бясспрэчнасць прыналежнасці пісьменніка да нашай айчыннай вербальнай і культурнай парадыгмы.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Album biograficzne zasiuïonych Polakyw i Polek wieku XIX : w 2 t. — Warszawa : Druk. Piotra Laskauera i S-ki w Warszawie, 1901—1903. — T. 2. — 1903. — 537 s.

2. *Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускае літэратуры / М. Гарэцкі. — Вільня : Кооп. таварыства «Друк», 1920. — 208 с.

3. *Мальдзіс, А. І.* Падарожжа ў XIX стагоддзе: з гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры : навук.-папуляр. нарысы / А. І. Мальдзіс. — Мінск : Нар. асвета, 1969. — 206 с.

4. *Мархель, У.* «Не шукаючы пахвалы…» / У. Мархель // Каратынскі, В. Творы : для ст. шк. узросту / В. Каратынскі ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. — Мінск : Маст. літ., 2009. — С. 3—8.

5. *Косціна, Ж. В.* Эстэтычны ідэал Вінцэся Каратынскага ў кантэксце сентыменталізму / Ж. В. Косціна // Весн. БарДУ. Сер. «Педагагічныя навукі. Псіхалагічныя навукі. Філалалагічныя навукі (Літаратуразнаўства)». — 2020. — Вып. 8. — С. 157—162.

6. *Korotycski, W.* Kilka szczegyiyw o rodzinie, miejscu urodzenia i miodoњсi Adama Mickiewicza / W. Korotycski. — Wilno : Drukarnia A. H. Kirkora, 1861. — 14 s.

7. *Syrokomla, W.* Siywko do czytelnika / W. Syrokomla // Korotycski, W. Czem chata bogata, tem rada / W. Korotycski. — Wilno : Drukarnia T. Glьcksberga, 1857. — S. 1—6.

8. *Korotycski, W.* Czem chata bogata, tem rada / W. Korotycski. — Wilno : Drukarnia T. Glьcksberga, 1857. — 98 s.

9. *Каратынскі, В.* Творы : для ст. шк. узросту / В. Каратынскі ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 334 с.

10. *Яскевіч, А. В.* Каратынскі: ля вытокаў нацыянальнай лірыкі і эстэтыкі / А. В. Яскевіч // Полымя. — 2008. — № 5. — С. 142—159.

11. *Джеймс, Б.* Тайное станет явным. Шекспир без маски / Б. Джеймс, У. Д. Рубинстайн. — М. : Весь Мир, 2008. — 360 с.

12. *Санько, С.* Сонца / С. Санько, Я. Сахута // Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўн. ; рэдкал.: С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. — 2-е выд., дап. — Мінск, 2006. — С. 478—480.

13. *Дучыц, Л.* Тры / Л. Дучыц // Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўн. ; рэдкал.: С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. — 2-е выд., дап. — Мінск, 2006. — С. 506—507.

Паступіў у рэдакцыю 15.12.2021.

Репозиторий БарГУ